«Зацвярджаю»
Рэктар Беларускага нацыянальнага тэхнічнага ўніверсітэта

_________________С.В. Харытончык
“ 10 ” лістапада 2023 г.

ВОДЗЫЎ
на аўтарэферат дысертацыі Кітуркі Ірыны Фёдараўны
**«Станаўленне і развіццё дзяржаўнай мытнай службы Вялікага Княства Літоўскага (1764-1795 гг.)»,**
прадстаўленай на саісканне вучонай ступені доктара гістарычных навук па спецыяльнасці 07.00.02 - айчынная гісторыя

У сучасны перыяд, ва ўмовах аднаўлення функцый мытнай справы як рэгулятара знешнеэканамічных сувязяў, развіцця нацыянальнай эканомікі і стабілізацыі фінансаў, узрастае навуковая і практычая цікавасць да аналізу ролі і функцый мытных органаў, іх месца ў дзяржаўнай структуры, што аб'ектыўна патрабуе ўсебаковага вывучэння гісторыі і традыцый беларускай мытні. Уяўляецца разумным і рацыянальным аналіз вопыту інстытуцыялізацыі мытнай службы ў сістэме дзяржаўнай улады і кіравання. Такая гістарычная рэтраспекцыя, якая рэалізуецца ў рэчышчы гістарычнай навукі, актыўна запатрабавана гістарыяграфічнай практыкай апошніх гадоў.

У гістарыяграфіі тэма эвалюцыі мытнай справы і мытнай палітыкі на тэрыторыі Беларусі ўвогуле характарызуецца слабой распрацаванасцю і неабходнасцю ўвядзення ў навуковы зварот значнага эмпірычнага матэрыялу. Адзначым, што толькі некаторыя аспекты дадзенай тэмы закраналіся ў працах дарэвалюцыйных, савецкіх, сучасных беларускіх даследчыкаў, дзе праблема функцыянавання мытнай службы разглядалася ў разрэзе вывучэння урбанізацыйных працэсаў, рамесна-гандлёвых аперацый, аналізу сацыяльна-эканамічнага развіцця беларускага краю.

Стварэнне нацыянальнай мытні пасля атрымання Беларуссю суверэнітэту асабліва актуалізавала праблему неабходнасці вывучэння гісторыі развіцця мытнай службы і запатрабавала распрацоўкі перыдзацыі і сутнаснага напаўнення факталагічным матэрыялам кожнага з перыядаў гісторыі мытнай справы, што было зроблена ў некаторых вучэбных дапаможніках (нарыклад, В. Астрогі). Але гэтая праца – толькі пачатак шляху ў вывучэнні мытнай гісторыі Беларусі.

У гэтай сувязі навуковая значнасць дысертацыйнай працы Ірыны Фёдараўны Кітуркі складаецца з таго, што яна з'яўляецца першым у гістарычнай навуцы самастойным навуковым даследаваннем, у якім вырашана не раскрытая раней праблема станаўлення і развіцця дзяржаўнай

мытнай службы ВКЛ у другой палове XVIII ст. як спецыяльнага інстытута ў сістэме дзяржаўнага кіравання. Пэўная ступень навізны вынікаў і навуковых палажэнняў, якія сфармуляваны і вынесены аўтарам на абарону, вызначаюцца таксама і тым, што большая частка выкарыстаных пры напісанні дысертацыі матэрыялаў, упершыню ўводзіцца ў навуковы зварот.

Афармленне аўтарэферата цалкам адпавядае патрабаванням ВАК. У ім выразна фармулююцца мэта і задачы, аб'ект і прадмет дысертацыйнай працы, утрымліваецца інфармацыя пра сувязь з навуковымі праграмамі, асабісты ўклад саіскальніка, апрабацыю дысертацыі, апублікаванасць і выкарыстанне вынікаў даследавання. Аўтарам выносіцца на абарону дзевяць палажэнняў.

Апісанне асноўнага зместу работы пачынаецца з *аналіза стану гістарыяграфіі пытання, характарыстыкі крыніц, а таксама вызначэння метадалогіі даследавання* (раздзел 1.1 – 1.3). Пры вывучэнні гістарыяграфічнай традыцыі па тэме дысертацыі аўтар сфакусавала ўвагу на працах беларускіх, польскіх, літоўскіх, украінскіх і расійскіх даследчыкаў і прыйшла да высновы, што ў кола навуковых інтарэсаў замежных навукоўцаў не ўваходзіла вывучэнне рэгіянальных асаблівасцяў працы інстытуту мытнай службы на тэтыторыі Беларусі, а нацыянальная гістарычная навука хаактарызуецца значнай ступенню фрагментарнасці пытання. Варта адзначыць, што прыведзеныя ў дысертацыі крыніцы, якія класіфікаваны па пэўных відах, адпавядаюць пастаўленай мэце і дазваляюць ўсебакова вывучыць гісторыю дзейнасці мытнай службы ў ВКЛ у другой палове XVIII ст. Асабліва значным падаецца знаёмства і ўвядзенне ў навуковы зварот саіскальніцай архіўных матэрыялаў справодства са спецыяльнага фонда Скарбавай камісіі ВКЛ. Вылучаная аўтарам гіпотэза аб тым, што “у другой палове XVIII ст. ва умовах пошуку механізмаў умацавання сістэмы дзяржаўнага кіравання і неабходнасці стабілізацыі фінансавага становішча ў ВКЛ была створана мытная служба як спецыяльны інстытут у сістэме выканаучай улады для ажыццяўлення дзяржаўнай мытнай палітыкі і забеспячэння фіскальных і іншых паўнамоцтваў у галіне мытнай справы” (с. 20), мае гістарычную абгрунтаванасць і цалкам адпавядае мэтам мадэрнізацыйнай праграмы, якая была прынята на канвакацыйным сойме ў 1764 г.

*У другой главе* вылучана роля дзяржавы ў рэалізацыі новых падыходаў да арганізацыі мытнай службы пасля 1764 г., калі і ўзнікла Скарбавая камісія, першы у гісторыі ВКЛ орган, які ствараў і рэгуляваў дзейнасць дзяржаўнай мытнай службы і развіццё мытнай справы ў краіне (раздзел 2.1 – 2.3). Аналіз кадравага і матэрыяльнага забеспячэння дзейнасці дзяржаўнай мытнай службы ВКЛ, праведзены *ў трэцяй главе* (раздзел 3.1-3.5), дазволіў прыйсці да высновы, што пры паступленні на дзяржаўную мытную службу аддавалася перавага кандыдатам выключна каталікам шляхецкага паходжання з пэўным адукацыйным узроўнем, досведам у мытнай працы і пры наяўнасці паручыцельства ад іншага дзяржаўнага служачага шляхецкага паходжання (с. 23, 36). Больш таго, для дзяржаўных мытных чыноўнікаў

уводзіліся правілы паводзін на службе, нормы службовай субардынацыі і этыкету, а таксама фіксавыныя грашовыя стаўкі аплаты працы (жалавання) у адпаведнасці са штатным раскладам і магчымасцю атрымання прэмій за добрасумленную працу (с. 25). Дадзеныя вынікі могуць сведчыць, што ў другой палове XVIII ст. дзяржаўная мытная служба ВКЛ набыла сапраўдныя рысы арганізаванай структуры. *Чацвёртая глава* прысвечана трансфармацыі тэрытарыяльнага размяшчэння мытняў на тэрыторыі ВКЛ у 1765-1795 гг. з вылучэннем іх дакладнай колькасці і струкуры (раздел 4.1-4.4.), што было звязана са знешнепалітычнай кан'юнктурай для Рэчы Паспалітай у перыяд першага і другога падзелаў. *У пятай главе* разглядаецца роля мытнай службы ВКЛ у ажыццяўленні дзяржаўнай эканамічнай палітыкі ў другой палове XVIII ст. (раздзел 5.1-5.5). Значнай і пацверджанай крыніцамі падаецца выснова саіскальніцы аб тым, што ў другой палове XVIII ст. мытная дзяржаўная служба не столькі займалася спагнаннем мытных падаткаў і выконвала фіскальную функцыю, колькі ператвырылася ў сапраўдны інстытут па фарміраванні належнай мытнай палітыкі, накіраванай на падтрыманне ўласнага вытвоцы і стымуляванне развіцця ўласнай эканомікі (с. 27, 37). Больш таго, мытні, дзякуючы усталяванню ўніфікаванага мытнага справаводства, сталі неад'емнымі элементамі ў структуры выканаўчай улады, якія ў цэлым адыгрывалі значную ролю ў ажыццяўленні дзяржаўнай эканамічнай палітыкі. *У шостай главе* "Дзяржаўны кантроль за дзейнасцю мытнай службы ВКЛ у другой палове XVIII ст." разгледжаны арганізацыя Скарбавай камісіяй ВКЛ сістэматычнага кантролю працы дзяржаўнай мытнай службы ў форме люстрацый і інспекцый, а таксама механізмы і прэёмы ўдасканалення вядзення мытнай справы ў ВКЛ (раздзел 6.1-6.5).

Асноўныя палажэнні і вывады дысертацыі І.Ф. Кітуркі знайшлі дастаткова поўнае тэматычна рэпрэзентатыўнае адлюстраванне ў 36 навуковых працах, выкананых аўтарам самастойна, у тым ліку ў манаграфіі "Дзяржаўная мытная служба Вялікага Княства Літоўскага ў другой палове XVIII стагоддзя (1764-1795 гады)" (Гродна: ГрДУ, 2023), 19 артыкулах у выданнях, уключаных ВАК Рэспублікі Беларусь у пералік навуковых выданняў для апублікавання вынікаў дысертацыйных даследаванняў, 16 іншых публікацыях па тэме даследавання.

Вынікі дысертацыйнай працы І.Ф. Кітуркі, абагульненні і вывады, якія ў ёй змяшчаюцца, маюць як навуковае, так і практычнае значэнне. Асноўныя палажэнні даследавання дазваляюць глыбей асэнсаваць палітычную, сацыяльна-эканамічную гісторыю Беларусі, даюць больш цэласнае ўяўленне аб функцыянаванні інстытуту мытнай справы ў час існавання ВКЛ і раскрываюць сутнасць рэформаў перыяду 1760-1790-х гг. Паказальна, што вынікі дысертацыйнага даследавання ўжо прайшлі апрабацыю ў адукацыйным працэсе, пра што сведчаць 11 актаў аб укараненні вынікаў даследавання ў розных установах вышэйшай адукацыі, у тым ліку, у Беларускім нацыянальным тэхнічным універсітэце пры выкладанні

дысцыплін "Гісторыя беларускай дзяржаўнасці", "Гісторыя мытнай справы і мытнай палітыкі Беларусі". Матэрыялы і вывады дысертацыі і далей могуць быць выкарыстаны ў працэсе рэалізацыі новых навуковых праектаў, а таксама пры напісанні абагульняючых прац па гісторыі Беларусі, па гісторыі мытнай справы і мытнай палітыкі Беларусі, пры падрыхтоўцы раздзелаў падручнікаў, праграм і спецкурсаў.

Такім чынам, змест аўтарэферата паказвае, што дысертацыя Ірыны Фёдараўны Кітуркі адпавядае патрабаванням, што прад'яўляюцца да падобнага роду кваліфікацыйных навуковых прац, а сам аўтар заслугоўвае прысуджэння вучонай ступені доктара гістарычных навук па спецыяльнасці 07.00.02 – айчынная гісторыя.

Водзыў на аўтарэферат дысертацыі І.Ф. Кітуркі быў абмеркаваны і прыняты адкрытым галасаваннем на пашыраным пасяджэнні кафедры "Мытная справа". На пасяджэнні прысутнічалі: д.т.н., дацэнт, прафесар кафедры "Мытная справа" Галубцова А.С., к.пед.н., дацэнт, дацэнт кафедры "Мытная справа" Броўка Г.М., загадчык кафедры "Мытная справа", к.э.н., Мазанік Ю.М., к.ф.-м.н., дацэнт кафедры "Мытная справа" Шавель А.М., к.ю.н., дацэнт, дацэнт кафедры "Мытная справа" Акіменка К.В., к.г.н., дацэнт, дацэнт кафедры "Менеджмент" Багдановіч А.Г., к.г.н., дацэнт кафедры "Менеджмент" Мацяс І.Дз., к.г.н., дацэнт, дацэнт кафедры "Гісторыя" Лепеш А.В., ст. выкладчык кафедры "Мытная справа" Альшэўская В.В., ст. выкладчык кафедры "Мытная справа" Галай Т.А., ст. выкладчык кафедры "Мытная справа" Жэўлакова А.Ю., ст. выкладчык кафедры "Мытная справа" Кавалькова І.А., ст. выкладчык кафедры "Мытная справа" Лабковіч В.М. Вынікі галасавання: "за" – 14, "супраць" – няма, "устрымаліся" – няма (пратакол № 3 кафедры "Мытная справа" ад 03.11.2023).

Загадчык кафедры
"Мытная справа", к.э.н. Ю.М. Мазанік